Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка



# Праведная Сафія, княгіня Слуцкая

*Да 400-годдзя з дня спачыну*
*праведнай святой Сафіі, княгіні Слуцкай*

Слуцк, 2012

Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў
Даведачна-бібліяграфічны сектар

# Праведная Сафія, княгіня Слуцкая

*(Да 400-годдзя з дня спачыну праведнай святой Сафіі, княгіні Слуцкай)*

## Інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне

Слуцк, 2012

*Заступніца зямлі нашай – Сафія!*
*За горад Слуцк, за ўвесь гаротны край*
*Маліся… І малітвамі тваімі*
*Абманутыя душы прасвятляй.*

*(А. Сурба)*

Слуцк – невялікі горад у Мінскай вобласці, і тым не менш ён мае сваю унікальную і слаўную гісторыю. Знакамітыя слуцкія паясы – візітная картка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі. “Слуцкае Евангелле”, перапісанае ад рукі самім слуцкім князем Юрыем Алелька яшчэ ў канцы XVI стагоддзя і цудам захаванае да нашых дзён, - не толькі нацыянальная гістарычная рэліквія, але і вялікая святыня для праваслаўных вернікаў. Слуцкі храм у імя святога Архангела Міхаіла, пабудаваны ў другой палове XVIIIстагоддзя з дрэва ў стылі народнага дойлідства з элементамі барока, з 1990 года атрымаў статус сабора . Слуцк увайшоў у гісторыю як астравок праваслаўя, згуртаваўшы многіх веруючых у часы паўсюднага насаджэння уніяцтва.

Цярністы і вузкі той шлях, па якому ішлі к Богу Святыя зямлі Беларускай, да ліку якіх адносіцца і святая Сафія, княгіня Слуцкая. Заслугі Сафіі – апошняй прадстаўніцы роду рыцараў Праваслаўя князёў Алелькавічаў – перад Богам і народам цяжка перааценіць: яна была заступніцай храмаў, манастыроў і абаронцай правоў аднаверцаў у самыя цяжкія часы ганенняў на Праваслаўе.

Прапанаванае выданне пазнаёміць чытачоў з жыццёвым шляхам святой Сафіі, княгіні Слуцкай. Уся літаратура, якая змешчана ў інфармацыйна-бібліяграфічным выданні і маецца ў фондах Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі, сабрана ў чатырох раздзелах: “Святая заступніца зямлі Слуцкай”, “Сафія па-ранейшаму свой край абараняе” (адкрыццё помніка Сафіі Слуцкай у Слуцку), “Вобраз Сафіі Слуцкай у мастацтве і літаратуры”, “Святую Сафію ўсхвалім!: да 400-годдзя з дня спачыну святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай”. Матэрыял размешчаны ў алфавітным парадку, адрасаваны шырокаму кругу чытачоў.

## *“Святая заступніца зямлі Слуцкай”*

У Свята-Духаўскім Кафедральным саборы Мінска (на плошчы Свабоды) спачываюць нятленныя мошчы святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай. Сафія Юр’еўна Алелькавіч, княжна, а потым – княгіня Слуцкая вызначалася пакорлівасцю перад Богам, набожным і вельмі нялегкім жыццём, супрацьстаяла сілам зла. Праведная Сафія была апошняй княгіняй слаўнага роду князёў Слуцкіх і Капыльскіх, нашчадкаў вялікага князя Альгерда з роду Рурыкавічаў. Некаторыя з гэтага роду займалі ў свой час Кіеўскі прастол, іншыя былі князямі Ноўгарада Вялікага.

Святая праведная Сафія нарадзілася ў 1585 годзе. Быццам у азнаменаванне будучай мудрасці Слуцкай княгіні княжну Алелькаўну назвалі Сафія – Прамудрасць. У тым жа годзе памерла яе маці, а хутка – і бацька яе князь Юрый. Апеку над сіратой, якая ў малым узросце стала багатай наследніцай, прынялі на сябе яе сваякі: спачатку Жмудскі стараста Юрый Хадкевіч, які ўзяў яе з сабою ў Вільню, а потым Віленскі кашталян, Брэсцкі стараста Іеранім Хадкевіч, дзядзька Сафіі.

Абодва апекуны юнай Сафіі запазычылі князям Радзівілам значныя грашовыя сумы і хацелі выкарыстаць сваю апеку: яны вырашылі выплаціць свае даўгі пасагам малалетняй княжны. Таму Хадкевічы і сасваталі адзінаццацігадовую Сафію за Нясвіжскага князя Януша Радзівіла, сына Віленскага ваяводы Крыштофа. Дамова была замацавана пісьмовым дакументам, у адпаведнасці з якім шлюб павінен быў адбыцца пасля дасягнення княжной паўналецця. Князю Янушу дазволена было бачыцца з юнай Сафіяй, якая жыла тады ў віленскім доме Хадкевічаў.

Аднак праз некаторы час Радзівілы раптоўна наклалі забарону на адзін з маёнткаў Хадкевічаў у кошт аплаты старога доўгу. Разгневаныя даўжнікі неадкладна забаранілі спатканні князя Януша з княжной Сафіяй; абодва бакі не думалі саступаць – усе рыхтаваліся да міжродавай вайны. Радзівілы сабралі 6000 чалавек узброенай пяхоты і конніцы, умацавалі гарматамі свой палац. Хадкевічы ў сваю чаргу сабралі да 1600 коннікаў і 600 чалавек пяхоты – гэтага было дастаткова для абароны ператворанага ў непрыступную крэпасць з 24 гарматамі віленскага дома, які стаў сховай для княжны-заложніцы. Юная Сафія няспынна маліла Бога спыніць непазбежнае кровапраліцце. Адпраўленыя каралём пасланцы здолелі прадухіліць змаганне і схіліць абодва бакі да міру. Хутка паміж нядаўнімі ворагамі зноў было дасягнута пагадненне аб тым, што Радзівілы спыняюць любыя грашовыя прэтэнзіі, а таксама выдаюць Хадкевічам пасведчанне аб правільным вядзенні спраў па апецы над маёмасцю княжны Сафіі, нявесты князя Януша.

Калі княжна дасягнула ўзросту, які дазваляў уступіць у шлюб, Януш Радзівіл звярнуўся да Рымскага папы з просьбай аб дазволе яму як каталіку заключыць шлюб з княжной Сафіяй Слуцкай, праваслаўнай, якая паставіла абавязковую ўмову, каб дзеці ад гэтага шлюбу былі абавязкова праваслаўныя. Шлюб княжны Сафіі Юр'еўны і князя Януша Радзівіла адбыўся па праваслаўнаму абраду ў 1600 годзе. Не салодкім было жыццё княжны Сафіі пад апекай карыслівых Хадкевічаў, не стала яно саладзейшым і ў замустве. Уцехай і суцяшэннем была для княгіні Слуцкай праваслаўная вера: ва ўсіх засмучэннях сваіх з ранняга дзяцінства звярталася яна да Бога. Але асабісты смутак княгіні зацьміла яшчэ адно гора: царкоўная унія з Рымам, аб'яўленая на тагачасных землях Беларусі з 1596 года. У перыяд заключэння уніі Слуцк належаў княгіні Слуцкай. Яна і стала абаронцай праваслаўных святыняў. Праваслаўныя знайшлі ў маладой княгіні вялікі маральны ўплыў, духоўную і матэрыяльную падтрымку, якія далі жыхарам горада магчымасць згуртавацца з мэтай абароны Праваслаўя ў Слуцкае Праабражэнскае Брацтва. Праведная Сафія прымала самы актыўны ўдзел у дзейнасці Брацтва як высоказнакамітая братчыца. Яна пераканала свайго мужа-каталіка вытрабаваць у польскага караля грамату аб забароне прымусу да уніі праваслаўных. Такая грамата была выдадзена. Такім чынам, дзякуючы вялікім намаганням набожнай захавальніцы Праваслаўя горад Слуцк застаўся адзіным горадам Паўночна-Заходняга краю, які, будучы цвярдыняй веры, завешчанай продкамі, захаваў цэласнасць, чысціню і недатыкальнасць вучэння, якое асвяціла землі рускія ў 988 годзе.

Уплыў праведнай княгіні быў такі вялікі, што нават муж яе князь Януш Радзівіл пазней выдаваў граматы ў падтрымку Праваслаўя, глыбока паважаючы завешчаныя набожнай Сафіяй традыцыі. У адной з такіх грамат сказана: "…цэрквы і манастыры рэлігіі старарускай у маёнтках маіх па-ранейшаму павінны быць захаваны, і нашчадкі мае павінны захоўваць, каб не рабілася ў тым ніякай перамены".

Акрамя юрыдычнай абароны Праваслаўя, княгіня Сафія заўсёды клапацілася аб матэрыяльным забеспячэнні манастыроў, цэркваў, шчодра ахвяравала на храмы Божыя, уласнаручна вырабляла дарагія, вышытыя золатам і серабром святарскія аблачэнні, выдзяляла сродкі на будаўніцтва цэркваў. У дні храмавых святаў высоказнакамітая братчыца як паломніца падарожнічала ў самыя аддаленыя храмы.

Дзякуючы дзейнасці княгіні Сафіі Слуцк яшчэ пры жыцці гэтай вялікай угодніцы атрымаў асаблівае значэнне ў рэлігійных адносінах для ўсяго Паўночна-Заходняга краю, захаваўшы ў чысціні і недатыкальнасці Праваслаўе. Горад паступова станавіўся рэлігійным і царкоўна-адміністрацыйным цэнтрам Белай Русі.

Памерла праведная Сафія ва ўзросце 26 гадоў 1 красавіка (па новаму стылю) 1612 года ад першых родаў мёртванароджанай дачкі. Пасля смерці стала ушаноўвацца ў народзе як святая заступніца хворых жанчын, якія рыхтаваліся стаць мацяркамі. Афіцыйная кананізацыя праваслаўнай царквой святой Сафіі,

княгіні Слуцкай адбылася ў 1984 годзе. Памяць праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай, адзначаецца 1 красавіка (19 сакавіка па старому стылю).


1. Беларускі Праваслаўны каляндар. 1997. Звод імёнаў святых. Мінская епархія. Беларускія праваслаўныя святыні / уклад. Т. А. Матрунчык, Г. М. Шэйкін, А. А. Яскевіч. – Мінск: Свята-Петра-Паўлаўскі сабор г. Мінска , Беларускае Праваслаўнае Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў, 1996. – 160с.: іл. - Са зместу: [Сафія Слуцкая]. – С. 115-116, 131. М 94
2. Вейго, М. Святая праведная София княгиня Слуцкая//Случчына: мінулае і сучаснасць. – Слуцк, 1995. – С. 59-64. М 93
3. Гісторыя беларускай літаратуры XI-XIXст. Т. 1. Даўняя літаратура, XI – першая палова XVIIIстагоддзя. – Мінск: Бел. Навука, 2006. – 910с. са зместу: твор з кнігі “Дзесяць розных помнікаў” – нэнія (галашэнне) на магілу Соф’і Алелькавай, княгіні Слуцкай. – С. 654. (аўтар Саламон Рысінскі). М 93
4. Грыцкевіч, А. П. Радзівіл Соф’я, Соф’я Слуцкая//Рэлігія і царква на Беларусі. – Мінск, 2001. – С. 275. М 93
5. Грыцкевіч, А. Радзівіл Соф’я // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: Т. 6. Кн. 1: Пузаны – Усая/Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2001. - С. 61. М 902
6. Грыцкевіч, А. Радзівіл Соф’я (1.5.1585 – 1(19).3.1612), рэлігійная дзяячка, беларуская праваслаўная святая /Анатоль Грыцкевіч//Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя /рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск, 2006. – Т. 2. К-Я. – С. 497. М 94
7. Масляніцына, І.А. Радзівіл (Алелька – Радзівіл) Соф’я (11.5.1586-19.3.1612) /І. А. Масляніцына // Асветнікі зямлі Беларускай: X–пачатак XXст.: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – 2-е выд. – Мінск, 2009. – С. 344 -345. М94
8. Праведная Сафія, княгіня Слуцкая // Пачаткі Праваслаўя. – Мінск, 1998. – С. 109. М 9
9. Праведная Сафія, княгіня Слуцкая//Святыя зямлі Беларускай. Жыццеапісанні/уклад. Л. Я. Кулажанка, Т. А. Матрунчык. – Мінск: Прыход Свята-Петра-Паўлаўскага сабора, 2012. - С. 43-47. М 94
10. [Сафія Алелькавіч і Януш Радзівіл]//Чаропка В. Уладары Вялікага княства. – Мінск, 1996. – Мінск, 1996. – С. 259-263, 276-279. М 93
11. Святая благоверная София, княгиня Слуцкая: житие/сост. Н. Н. Фоменков. – Минск: Православная инициатива, 2005. – 31с.: ил. ББК 86.372
12. Святло далёкай зоркі: [Соф’я Слуцкая]//Памяць: гіст.- дакум. хроніка Слуцкага раёна і г. Слуцка. – Кн. 1-я. – Мінск, 2000. – С. 49-52. М 902

13. Соф'я Слуцкая//Беларуская энцыклапедыя: У 18т., Т. 15. Следавікі – Трыо/рэдкал. Г. П. Пашкоўі інш. – Мінск, 2002. – С. 91. М 902
14. Хранительница православия София: София Слуцкая//Слутчина. История и современность /Слуцкий районный исполнительный комитет. – Минск: БЕЛТА, 2011. – С. 14. 26.89(4Беи)
15. Яскевіч, А. Падзвіжнікі і іх святыні: духоўная культура старажытнай Беларусі. – Мінск: Полымя, 2001. - Са зместу: Сафія Слуцкая. – С. 96-97. ББК 86.37

***

1. Александров, Н. Отсюда русская земля стала есть / Н. Александров// Преображение. -–1999. - № 10. – С. 18-19. – Из содерж.: История жизни святой Софии Слуцкой, нетленные мощи которой находятся в Свято-Духовом Кафедральном соборе г. Минска. С. 8. М 93
2. Вайтовіч, А. Праведная Сафія, княгіня Слуцкая / А. Вайтовіч // Алеся. – 1999. - № 11. – С. 19. М 93
3. Века, А. Апошняя са слаўнага роду: Соф'я Алелькавіч (1585-1612) / А. Века // Настаўніцкая газета. – 2004. – 20 сакавіка. М 93
4. Галоўка, С. Заступніца духоўнай спадчыны: Соф'я Слуцкая / С. Галоўка //Мінская праўда. – 2004. – 10 крас. М 93
5. Галоўка, С. Заступніца праваслаўя: Сафія слуцкая / С. Галоўка // Мінская праўда. – 2005. – 6 каст. – С. 8. М 94
6. Галуза, Г. М. Святыни Минского кафедрального собора / Галина Михайловна Галуза//Народная асвета. - 2010. - № 8. – С. 56-57. - Из содерж.: Слуцкая княгиня Софья Юрьевна Олелько. – С. 57. М 94
7. Данильченко, Е. Слуцкая, но не Анастасия … / Елена Данильченко // Рэспубліка. – 2004. –1 крас. М 93
8. Дичковский, Г. Праведная София, княгиня Слуцкая / Г. Дичковский// Гаспадыня. – 2003. - № 4. – С. 30-31. М 93
9. Достанко, А. День памяти покровительницы края, княгини Софии Слуцкой/ А. Достанко // Кур'ер. – 2005. - № 14. – С. 5. М 93
10. Заступніца хворых жанчын: [Сафія Слуцкая]// Алеся. – 2010. - № 4. – С. 9. М 94
11. Кароткі, У. Дзве Соф'і і Януш …[Аб Соф'і Алелькавіч, Соф'і Брандэнбургскай і Янушы Радзівіле]//Маладосць. – 1990. - № 7. – С. 155-158. М 9
12. Кенька, М. Аповесць пра Соф'ю Слуцкую / М. Кенька // Культура. – 2001. - № 50. – С. 14. М 93
13. Кенька, М. І стала ў Слуцку Сафія / М. Кенька // Бібліятэка прапануе. – 2001. –№ 1. – С. 4-6. М 902
14. Корженевская, Г. В поисках духовного клада: [коллективная работа Минского прихода во имя святой праведной Софии Слуцкой ]/ Г. Корженевская //Бібліятэка прапануе. – 2006. – № 2. – С. 14-15. М 93

15. Крашэўскі, Ю. І. Апошняя са слуцкіх князёў: хроніка з часоў Жыгімонта Трэцяга / Юзаф Ігнацы Крашэўскі: пераклаў з польс. Міхась Кенька // Маладосць. – 2008. - № 4, 5, 6, 7, 8, 9. ББК 84(4Пол), М 94, М 87
16. Кузняцоў, М. Святая зямлі беларускай [Княжацкі род Слуцкага княства]/ М. Кузняцоў // Рэспубліка. – 1993. – 7-8 ліп. М 9
17. Кургановіч, Д. Каханне ў гісторыі: (гістарычна-літаратурна-музычная кампазіцыя для вучняў 11-12-х класаў / Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. - № 2. – С. 62-67. - Са зместу: [слуцкія княгіні Настасся Іванаўна і Соф'я Алелькавічы]. – С. 64. М 94
18. Лук'янцава, Л. Святая Сафія, княгіня Слуцкая / Л. Лук'янцава, І. Ціткоўскі // Кур'ер. – 2000. – 30 сакавіка. М 93
19. Ляўковіч, А. Святая княгіня: Соф'я Слуцкая/А. Ляўковіч//Звязда. – 1998. – 7 сакавіка. М 93
20. Малаховская, Г. "Святой мой не увидит тления": [О Софии Слуцкой, княгине, останки которой хранятся в Минском кафедральном соборе]/ Г. Малаховская//Семь дней. – 1991. - № 32. М 9
21. Масляніцына, І. Жанчыны зў гісторыі Беларусі: [Сафія Слуцкая]/ Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. - № 1. – С. 48. М 902
22. Масляніцына, І. Пані Радзівіл (Соф'я Юр'еўна Алелькавіч) / І. Масляніцына, М. Багадзяж // Краязнаўчая газета. – 2006. - № 42. – С. 6. М 94
23. Масляніцына, І. Святло далекай зоркі / Ірына Масляніцына, Мікола Багадзяж// Краязнаўчая газета. – 2010. – жнівень (№ 31, 32). – С. 4. М.94
24. Мельнікаў, А. Шлях немаркотны: праведная Сафія, княгіня Слуцкая/А. Мельнікаў//Беларусь. – 1992. - № 8. – С. 8-9. М 93
25. Палачанін, Ф. Светачы зямлі беларускай / Ф. Палачанін //Бібліятэка прапануе. – 2010. - № 3. – С. 4-7. – Са зместу: [святая даставерная княгіня Сафія Слуцкая]. – С. 4-5. М 94
26. Петрашкевич, Т. Великая угодница Божия: в православном календаре 1 апреля отмечено как День памяти праведной Софии, княгини Слуцкой /Татьяна Петрашкевич//Белорусская нива. – 2010. – 27 марта. – С. 5. М 94
27. Подлозная, Н. Княгини земли Слуцкой /Н. Подлозная //Капитал. – 2008. – 7 февр. (№ 9). – С. 3. – (Анастасия Слуцкая, Софья Слуцкая, Екатерина Слуцкая) М 94 М 93
28. Последняя из рода Олельковичей: Праведная София//Айсберг. – 1991. - № 3. – С. 3. М 92
29. Последняя из рода Олельковичей: София Слуцкая//ОСКА. – 2004. – 13 октября. – С 3. М 98
30. Праспект Святой Соф'і Слуцкай//Беларуская мінуўшчына. – 1993. – № 5-6. – С. 27. М 9

31. Родчанка, Р. Нацыянальная гераіня. [Пра слуцкую княгіню Соф'ю Алелькавіч – канец XVI-пачатакXVII ст.]//Літаратура і мастацтва. – 1990. – 14 верасня. М 9
32. Родчанка, Р. У гонар памяці Соф'і [Алелькавіч]//Слуцкі край. - 1992. – 26 верас. М 9
33. Рублевская, Л. Последняя из рода Олельковичей: духовный подвиг Софии Слуцкой / Людмила Рублевская // Беларусь сегодня. – 2008. – 29 апр. – С. 11 М 94
34. Салодкіна, Л. Заступніца зямлі Слуцкай /Ларыса Салодкіна//Слуцкі край. – 2010. – 2 крас. – С. 5. – ( 1красавіка – Дзень памяці Сафіі Слуцкай). М 94
35. Саладкіна, Л. Заступніца Слуцкая:[ Сафія Слуцкая]/ Л. Салодкіна // Слуцкі край. – 2006. – 16 верас. – С. 4. М 94
36. Скеп'ян, Н. Да пытання пра веравызнанне Соф'і Слуцкай/Н. Скеп'ян // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. - № 10. –С. 46-51 ББК 63.3(4Беі)45
37. София, княгиня Слуцкая//Мир женщины. – 1996. - № 4. – С. 70. М 9
38. София Слуцкая – святая княгиня/подгот. Анна Маслакова//Алеся. – 2011. - № 10. – С. 18-19. М 94
39. Соф'я Алелькавіч (1585-1612)//Новыя кнігі. – 1998. - № 10. – С. 9-11. – (Дадатак). М 94
40. Тычына, М. Соф'я, князёўна Слуцкая//Мінская праўда. – 1993. – 27 сакавіка. М 9
41. Тычына, М. У памяць князёўны, Соф'і Слуцкай / М. Тычына // Дзіва. – 1996. – 12 студз. М 93
42. Филипчик, В. История Софии Слуцкой, или Как была предотвращена «домашняя война»/В. Филипчик // Рэспубліка. – 2006. – 12 верас. М 93
43. Ціткоўскі, І. На пачатку 1600 года: Хадкевічы і Радзівілы. Сафія Алелькавіч / І. Ціткоўскі // Кур'ер. – 2000. - 9 сакавіка. М 93
44. Ціткоўскі, І. Уладары нашага краю: Сафія благаверная / І. Ціткоўскі // Кур'ер. – 2001. – 4 кастр. М 93
45. 420 год з дня нараджэння Соф'і Слуцкай (1585- 1612), рэлігійнай дзяячкі, асветніцы, беларускай праваслаўнай святой//Новыя кнігі. – 2005. - № 2. – С. 2-4. (Дадатка). М 93
46. Шрамко, А. Праздник на все времена: [Святая София Слуцкая]/А. Шрамко//Сям'я. – 1999. - № 13. – С. 4. М 94
47. Яніцкая, М. Уводзіны ў свет хрысціянскіх вобразаў /М. Яніцкая/ /Мастацтва. – 1999. - № 7. – С. 38-42. - Са зместу: [Пра залічэнне да наваградскага праваслаўнага асяродка Соф'ю, княгіню Слуцкую]. – С. 41 М 93
48. Яроцкая, Ю. Праведная София Слуцкая / Юлия Яроцкая // Белорусская военная газета. – 2010. – 30 июня. – С. 5. М 94

## *Сафія па-ранейшаму свой край абараняе*

***(пра адкрыццё помніка Сафіі Слуцкай у Слуцку)***

Упершыню надзея на тое, што ў горадзе на Случы будзе ўзведзены помнік княгіні Сафіі з'явілася вясной 1994 года. Наведаўшы Слуцк у дзень Святога Архістрата Міхаіла, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт сустракаўся з прадстаўнікамі горада. Свецкія ўлады з Філарэтам пагадзіліся.



Праз два гады, у чэрвені 1996 года, у гарадскі выканаўчы камітэт паступіла праектная прапанова ад вядомага сталічнага архітэктара Лук'янчыка і маладога, вельмі таленавітага скульптара (у той час - студэнта выпускнога курса Беларускай акадэміі мастацтваў) Інкова, якія па благаславенні Уладыкі Філарэта і ўзгадненні з гарадскімі ўладамі распрацавалі праект і нават выканалі рабочую мадэль Святой Сафіі. Кіраўніцтва ўсімі арганізацыйна-гаспадарчымі работамі па ўзвядзенні помніка Беларускі Экзархат Рускай Праваслаўнай Царквы ўсклаў на настаяцеля Слуцкага Свята-Міхайлаўскага сабора айца Міхаіла (Вейга).

Першы грашовы ўзнос быў зроблены адным з жыхароў Слуцка 7 сакавіка 1999 г. Яго імя, на жаль, даведацца не ўдалося. Як, зрэшты, і сотні імёнаў іншых случчан ( і не толькі), што ўнеслі сваю лепту ў будаўніцтва помніка. Грошы на выраб і ўстаноўку пералічылі таксама дзесяткі дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў…

А 23 чэрвеня 1999г. было канчаткова вызначана і месца ўзвядзення помніка. Менавіта ў гэты дзень Слуцкі гарвыканкам прыняў рашэнне аб выдзяленні Свята-Міхайлаўскай царкве зямельнага ўчастка плошчай 0,10 га па вуліцы Багдановіча.24 верасня 2000г. у цэнтры горада быў адкрыты помнік Сафіі Слуцкай.

Амаль трохметровая бронзавая  статуя Сафіі, якая асяняе крыжам свой горад, узвышаецца на пастаменце з мармуровым абрамленнем. За спінай заступніцы Слуцкага краю – тры паўаркі, злітыя разам. Яны сімвалізуюць храм, і таму пад іх купаламі вісіць звон, а вянчае гэтую малую архітэктурную форму залацістая постаць анёла, які трубіць у трубу.


1. Адкрываецца помнік Сафіі Слуцкай // Слуцкі край. – 2000. – 20 верасня. М 73
2. Анатольева, Н. У гонар праведнай Сафіі:[ адкрыццё і асвячэнне помніка святой Сафіі Слуцкай] /Н. Анатольева // Слуцкі край. – 2000. - 27 верасня. М 73

3. Бахарава, М. Помнік святой Сафіі Слуцкай павінен стаяць у Слуцку / М. Бахарава // Культура. – 1998. - № 15. – С. 2 ; Царкоўнае слова. – 1998. - № 4. – С. 14-15.    М 73
4. Богдашиц, С. Памятник Софии Слуцкой – 10 лет / Сергей Богдашиц, Алесь Достанко // Кур'ер. – 2010. – 22 ліп.  (№ 29). – С. 6.   М 715
5. Будет ли в Слуцке памятник святой Софии?// ОСКА. – 1998. – 2 декабря. М 73
6. Буркін, А. Сафія па-ранейшаму свой край абараняе: [у горадзе на Случы адбылося адкрыццё і асвячэнне помніка княгіні Сафіі Слуцкай]/ Алег Буркін // Чырвоная змена. – 2001. – 30 студз.М 715
7. В честь святой благоверной Софии – покровительницы Слуцкого края: [открытие памятника в г. Слуцке]// Кур'ер. – 2000. – 21 верасня. – С. 1.   М 73
8. Вайніцкі, П. М. М. Інькоў – аўтар помніка Сафіі Слуцкай (1998) // Роднае слова. – 2004. - № 3. – С. 89.   М 715
9. Ведрыч, Н. Сын зямлі беларускай: духоўны подзвіг Анатоля Статкевіча-Чабаганава / Наталля Ведрыч // Роднае слова. – 2010. - № 4. – С. 103-104. М 715 ( А. Статкевіч-Чабаганаў – фундатар помніка Святой Сафіі ў Слуцку)  М 715
10. Вейго, М. Отец Михаил: "Софию воспитало православие"/ М. Вейго; записал Сергей Жуков // Кур'ер. – 2000. – 12 кастрычніка.   М 73
11. Достанко, А. Нимб возвращен: [29 марта на памятник святой Софии Слуцкой вновь установили нимб, который в конце прошлого года был украден]/ Алесь Достанко // Кур'ер. – 2010. – 1 крас. (№ 13). – С. 3.   М 715
12. Жуков, С. Творение души и рук: разговор с авторами памятника Святой Софии Михаилом Иньковым и Николаем Лукьянчиком/ С. Жуков // Кур'ер. – 2000. – 5 кастрычніка.   М 73
13. Ляневіч, А. Там, дзе будзе помнік / Андрэй Ляневіч // Кур'ер. – 2000. – 17 лютага   М 715
14. О памятнике святой Софии в городе Слуцке // Преображение. – 2000. - № 2. – С. 3.   М 73
15. Памятник святой Софии будет стоять в Слуцке // Преображение. – 1999. - № 4. – С. 3.   М 73
16. Помнік святой Сафіі Слуцкай: аўтар Міхась Інькоў. Скульптура ўсталявана ў 2000г.//Спадчына. – 2001. - № 5-6. – 1 старонка вокладкі.   М 73
17. Святая благоверная София Слуцкая – покровительница Слуцкого края: [24 сентября2000г. будет установлен памятник Софии Слуцкой]// Преображение. – 2000. - № 9. – С. 1.   М 73
18. Тычына, М. Будзе помнік Соф'і Слуцкай / М. Тычына // Мінская праўда. – 1994. – 11 студз.   М 73
19. Щитковец, Г. Освящение памятника Святой Софии в Слуцке / Г. Щитковец// Преображение. – 2000. - № 10. – С. 1-3.   М 73

# *Вобраз Сафіі Слуцкай у мастацтве і літаратуры*

У жывапісе вобраз Сафіі Слуцкай знайшоў увасабленне ў графічным партрэце, вызначаным яе земляком М. Басалыгам, а таксама ў адным з партрэтаў з серыі, прысвечанай усім беларускім святым, работы А. Кашкурэвіча. Да адлюстравання вобраза князёўны звярталіся мастакі Ермакоў І. І., Лаурайценя І. І., Сакалова-Кубай Н. М., Шут В. У., Акулаў В. І. і нш.

Адражаецца памяць пра Сафію Слуцкую і ў слове. Яе Жыціе стварыў настаяцель слуцкай Міхайлаўскай царквы пратаіерэй Міхаіл Вейга, нарысы пра яе ёсць у кнігах І. Масляніцынай і М. Багадзяжа “Слава і няслаўе”.

Польскі пісьменнік Юзаф Крашэўскі ў 1841 годзе выдаў у Вільні аповесць”Апошняя са слуцкіх князёў”, дзе ў мастацкай форме апавядаецца гісторыя гэтай своеасаблівай “траянскай вайны” паміж двума родамі за жанчыну. Аўтар не толькі ўзнавіў ход падзей, але і пазнаёміў чытачоў з сацыяльным і рэлігійным становішчам у той час, правёў іх па вуліцах Вільні, пабываў з імі ў палацах Радзівілаў і Хадкевічаў, у Віленскім езуіцкім калегіуме, магістраце, ля шануемай беларусамі і палякамі іконы Вострабрамскай Маці Божай – усюды, куды трапялі ягоныя персанажы. Аповесць напісана не толькі пазнавальна, але і займальна, месцамі нават з гумарам, яна лёгка чытаецца. Яшчэ адзін мастацкі твор пра Сафію Слуцкую – гістарычная драма Уладзіслава Сыракомлі “Магнаты і сірата. Соф’я, князёўна слуцкая”, выдадзеная на польскай мове ў 1859 годзе.


1. Бажэнава, В. Дз. Радзівілы. Альбом партрэтаў XVIII-XIXстагоддзяў “Icones familiae dukalis Radivilianae”/В. Дз. Бажэнава; пер. на англ. мову Ю. В. Бажэнаў [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010. – 524с.: іл. – (Энцыклапедыя рарытэтаў). ББК 85.147 - Са зместу : [Сафія Алелькавіч] – С. 45.
2. Каламайска-Сайд, М. Партрэты і помнікі старадаўнасці, князёў Алелькавічаў у Слуцку: інвентарызацыя Юзэфа Смаліньскага з 1904г./ пераклад на беларускую мову разам са спісам ілюстрацый. – Варшава, 1996. – 96с. М 79
3. Крашэўскі, Ю. Кароль ў Нясвіжы. 1784. Апошняя са слуцкіх князёў: гіст. аповесці / Юзаф Крашэўскі; меравод з польскай мовы М. Кенькі. – Мінск: Маст. літ., 2009. – (Скарбы сусветнай літаратуры). ББК 84(4Пол)
4. Марціновіч, А. Нібы вясна – слуцкая краса: Соф’я Алелькавіч / Алесь Марціновіч// Хто мы, адкуль мы…: гістарычны эсэ, нарысы. – Мінск, 2007. – С. 16-25. ББК 63.3(4Беі)45
5. Масленицына, И. Рассказ о том, как будущая святая чуть не ввела в грех два магнатских рода: София Слуцкая // Масленицына, И. Кавалеры и дамы белорусского ренессанса. – Минск, 2000. – С. 182-188. М 93

6. Масленицына, И. А. София Слуцкая: повесть-эссе/ Ирина Масленицына, Николай Богодяж; вступ. ст. Н. А. Голубевой; рис. А. М. Кашкуревича. – Минск: Издательство «Четыре четверти», 2012. – 104 с.: ил.   84.(4Беи)
7. Святло далёкай зоркі: Соф'я Алелькавіч (1585-1612г.г.) // Масляніцына І. А., Багадзяж М. К. Слава і няслаўе. – Мінск, 1995. – С. 173-180.   М 9

***

1. В Минске установят памятник Софии Слуцкой // Мінская праўда. – 2012. – 31 сак. – С. 4.   М 79
2. Григорич, Л. Памятник Софии Слуцкой установят и в Минске / Леонид Григорич// Кур'ер. – 2012. – 26 студз. (№ 4). – С. 3   М 79
3. Іңькоў, М. Энергія эпохі Сафіі Слуцкай/ Міхаіл Іңькоў; [гутарыла] Дар'я Амяльковіч // Культура. – 2012. – 7 крас. (№14). -  С. 6
   Гутарка са скульптарам Міхаілам Іньковым, аўтарам помніка Сафіі Слуцкай у Мінску.  М 79
4. Кенька, М. [ВобразСафііСлуцкай у мастацтвеі літаратуры]/ М. Кенька// Бібліятэка прапануе. – 2001. - № 1. -  С. 6.   М 79
5. Ксяндзоў, А. [Карціна "Захавальніцы Беларусі: вобразы Анастасіі Слуцкай і Сафіі Слуцкай]/ А. Ксяндзоў // Культура. – 2006. - № 20. – С. 8.   М 79
6. Масляніцына, І. У гонар святой Сафіі Слуцкай / Ірына Масляніцына // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 6 крас. (№ 14). – С. 2.    М 79
7. Памятник святой Софии Слуцкой [открыт в Минске на территории одноименного православного прихода]// 7 дней. – 2012. – 5 апр. (№ 14). – С. 2.   М 79
8. Праз 150 гадоў // Культура. – 2010. – 15-21 мая (№ 20).    М 79
   Да 420-годдзя з дня нараджэння Сафіі Слуцкай на Першым нацыянальным канале беларускага радыё адбылася прэм'ера радыёспектакля па гістарычнай драме Уладзіслава Сыракомлі "Магнаты і сірата. Соф'я, князёўна Слуцкая".
9. Святая праведная София, княгиня Слуцкая / подгот. Яна Семина // Гаспадыня. – 2012. - № 4. – С. 35.  – (Молитва и икона – 2-я с. обл.)
10. Сыракомля, У. Магнаты і сірата (Зоф'я, князёўна Слуцкая): гістарычная драма з XVIIстагоддзя / Уладзіслаў Сыракомля; пер. з пол. Ірыны Багдановіч // Маладосць. – 2009. - № 6. – С. 75-94; № 7. – С. 72-97.   ББК 84(4Беи)
11. У Менску адкрылі помнік святой Сафіі // Наша слова. – 2012. – 4 крас. (№ 14). – С. 8.   М 79
12. Ціткоўскі, І. Аб князях слуцкіх Алелькавічах і іх партрэтах / І. Ціткоўскі // Культура. – 1997. - № 35. – С. 11.   М 73
13. Ціткоўскі, І. Цудоўны падарунак: [Кніга Марыі Каламайска-Сайд, падрыхтаваная на аснове працы мастака Юзэфа Смалінськага "Партрэты і помнікі старадаўнасці князёў Алелькавічаў у Слуцку]/ І. Ціткоўскі// Преображение. – 1998. - № 1. – С. 8-9.   М 73

# *Святую Сафію усхвалім!*

***(да 400-годдзя з дня спачыну святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай)***

“Радуйся, горада Слуцка і ўсяе зямлі нашай радасць і ўмацаванне” – такія словы гімна ў гонар беларускай князёўны XVI стагоддзя гучалі ва ўсіх праваслаўных храмах Беларусі. 1 красавіка споўнілася 400 гадоў са дня спачыну святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай. Беларуская Праваслаўная Царква на працягу ўсяго года будзе ўзгадваць сваю Святую ў адмысловых мерапрыемствах. Ёй будуць прысвечаны навуковыя канферэнцыі, выданні і набажэнствы.

31 сакавіка апоўдні на прыходзе ў гонар праведнай Сафіі ( Мінск, плошча Казінца) Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт адслужыў малебен святой і асвяціў помнік князёўны. Увечары Патрыяршы Экзарх узначаліў усяночную ля ракі з мошчамі святой, усяночныя ў іншых храмах адслужылі члены  Святога Сіноду. Раніцай набожная літургія ў Свята-Міхайлаўскім саборы сабрала нямала прыхаджан, жыхароў Случчыны, каб ушанаваць памяць пра святую заступніцу зямлі Слуцкай. Свяшчэннаслужыцелі, случчане хрэсным ходам ад Свята-Міхайлаўскага сабора накіраваліся да памятнага знака Святой Сафіі Слуцкай. Многія жыхары горада прынялі ўдзел у богаслужэнні каля помніка святой праведнай Сафіі Слуцкай.

У Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы прайшло духоўна-асветніцкае мерапрыемства “Святая заступніца зямлі Слуцкай” з удзелам Благачыннага праваслаўных прыходаў Слуцкай акругі, настаяцеля Свята-Міхайлаўскага сабора Протаіерэя Міхаіла Вейгі, падрыхтавана выстава “Сафія Слуцкая – рыцар праваслаўя” пра Случчыну праваслаўную, слуцкіх князёў Алелькавічаў, жыццёвы шлях княгіні. У галерэі мастацтваў адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі “Стаянне ў ісціне”. Творы выкананы ў розных жанрах і тэхніцы.





3 мая ў Мінску прайшла царкоўна—навуковая канферэнцыя, прысвечаная 400—годдзю з дня спачыну святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай. У ёй прынялі ўдзел свяшчэннаслужыцелі, вучоныя і спецыялісты розных галін ведаў. Сярод іх былі і прадстаўнікі Случчыны: кандыдаты багаслоўя Протаіерэй Міхаіл Вейга і іерэй Аляксандр Шклярэўскі, Ігар Ціткоўскі,

краявед і мастак. На мерапрыемстве былі разгледжаны важнейшыя гістарычныя і духоўныя аспекты, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Сафіі Слуцкай, прайшла прэзентацыя выдання, прысвечаная ёй, і экспазіцыйных матэрыялаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

З 24 чэрвеня напрацягу 13 дзён адбыўся хрэсны ход праваслаўных веруючых з Мінска ў Слуцк (праз Капыль і Грэск). У Слуцку на помніку Сафіі былі ўстаноўлены шэсць памятных гранітных пліт з выявамі праваслаўных храмаў і манастыроў горада, у тым ліку нават тых, якія страчаны. Эскізы падрыхтаваў слуцкі мастак і краявед Ігар Ціткоўскі.

Да 400-годдзя з дня спачыну святой праведнай Сафіі Праваслаўнай Царквой быў зацверджаны ордэн святой праведнай Сафіі Слуцкай. Ордэнам будуць узнагароджаны як царкоўныя, так і грамадскія дзеячы - за шматгадовае служэнне ў свяшчэнным сане ці за заслугі перад Беларускай Праваслаўнай Царквой. Акрамя гэтага, узнагароды ордэнам святой Сафіі Слуцкай могуць быць удастоены епархіі, манастыры, духоўныя навучальныя ўстановы і іншыя царкоўныя арганізацыі. Ордэн мае адну ступень. Згодна іерархіі ўзнагарод Беларускай Праваслаўнай Царквы, ён размешчаны ўслед за ордэнам Крыжа прападобнай Еўфрасінні Полацкай.



1. Святая праведная София Слуцкая и Православие в Беларуси: материалы к библиографическому указателю / сост. Т. А. Самойлюк. – Минск, 2012. – (400-летию со дня представления праведной Софии, княгини Слуцкой посвящается). М 69

***

1. Акафист праведной Софии Слуцкой// Преображение. – 2012. - № 3. – С. 11-14. М 69
2. Андрэеў, В. Есць што захоўваць / Віктар Андрэеў// Беларусь. – 2012. - № 4. – С. 44-45. – Са зместу: [Сафія Слуцкая ўваскрэсла ў бронзе] – С. 45. М 69
3. Боянков, П. (протоиерей). Святая благоверная княгиня София Слуцкая / протоиерей Павел Боянков// Белорусская военная газета. – 2012. – 30 марта. – С. 5. М 69
4. Боянков, П. (протоиерей). Святая благоверная княгиня София Слуцкая / протоиерей Павел Боянков// Преображение. – 2012. - № 3. – С. 15-17. М 69
5. Вейго, М. (протоиерей). 1 апреля – 400 лет со дня представления праведной Софии, княгини Слуцкой / протоиерей Михаил Вейго// Преображение. – 2012. - № 3. – С. 1. М 69

6. Вейго, М. (протоиерей). Святая благоверная княгиня София – Слуцкого края небесная покровительница / протоиерей Михаил Вейго// Преображение. – 2012. - № 3. – С. 3-8. М 69

7. «Града Слуцка и всея земли нашея радосце и утверждение»: 2012 год – год 400-летия памяти благоверной княгини Софии Слуцкой (1 мая 1585 – 1 апреля 1612) // Бібліятэка прапануе. – 2012. - № 4. – 3с. вокл. М 69

8. Достанко, А. В честь Софии Слуцкой / Алесь Достанко // Кур'ер. – 2012. – 5 крас. (№ 14). – С. 8. М 69

9. Крестный ход, приуроченный 400-летию представления святой Софии Слуцкой.

10. Иванов, В. Торжества в честь Софии Слуцкой/ Владимир Иванов // Кур'ер. – 2012. – 29 сак. (№ 13). – С. 3. М 69

11. Каваленка, І. "Сафія Слуцкая святая…" / Ірына Каваленка // Слуцкі край. – 2012. – 3 крас. – С. 2. М 69, М 642

12. Мерапрыемствы Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі і Галерэі мастацтваў, прысвечаныя 400-годдзю памяці Святой Праведнай Сафіі Слуцкай.

13. Конференция в честь Софии Слуцкой //Кур'ер. – 2012. – 10 мая (№ 19). – С. 6. М 69

14. Случчане приняли участие в церковно-научной конференции, посвященной 400-летию представления святой Софии Слуцкой, прошедшей 3 мая в Минске.

15. Минкевич, Л. Покровительница белорусской земли/ Людмила Минкевич, Владимир Быченя// Народная газета. – 2012. - 31 сак. – С. 5. М 6

16. Молитва праведной Софии Слуцкой // Преображение. – 2012. - № 3. – С. М 69

17. Мядзведзева, В. "Радуйся, горада Слуцка і ўсея зямлі нашай радасць і ўмацаванне" / Вольга Мядзведзева// Звязда. – 2012. – 31 сак.. – С. 2. М 69

18. Саўко, Г. Святая Сафія - апякунка сям'і/ Ганна Саўко // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 18 мая (№ 20). – С. 2. М 69

19. Навукова-практычная канферэнцыя "Сям'я, шлюб у сучасным свеце: адраджэнне традыцыйных духоўных каштоўнасцей" у рамках мерапрыемстваў, прысвечаных 400-годдзю з дня канчыны Сафіі Слуцкай.

20. Святую Софию восхвалим! // Алеся. – 2012. - № 4. – С. 21. М 69

21. Церковно-общественные мероприятия, посвященные памяти праведной Софии Слуцкой.

22. Селязнёва, Н. У памяць пра заступніцу зямлі роднай / Наталля Селязнёва // Слуцкі край. – 2012. – 3 крас. – С. 2. М 69

23. Хрэсны ход ад Свята-Міхайлаўскага сабора да памятнага знака Святой Сафіі Слуцкай.

24. Учрежден орден святой праведной Софии Слуцкой// Кур’кр. – 2012. – 19 студз. (№ 3). – С. 9.   М 69

25. Учрежден орден Софіі Слуцкой// Мінская праўда. – 2012. – 17 студз. – С. 1.   М 69

26. Учрежден орден Софии Слуцкой //Слуцкі край. – 2012. – 20 студз. – С. 1.   М 69

27. Решением Митрополита Минского и Слуцкого, Патриаршего Экзарха всея Беларуси Филарета и Святого синода Белорусской Православной Церкви учрежден специальный орден святой праведной Софии Слуцкой.

28. Чэмер, М. У гонар княгіні Сафіі Слуцкай/ Мікола Чэмер // Настаўніцкая газета. – 2012. – 31 сак. – С. 5.   М 69

На працягу 2012 года  Беларуская Праваслаўная Царква правядзе шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 400-годдзю са дня спачыну святой праведнай Сафіі Слуцкай.

## Дадатак I

### *Памятник Святой Софии Слуцкой*

Памятник на пьедестале,
Слуцкой Софии Святой.
Всем миром его создавали,
Он самый для нас дорогой.

В бронзе стоит воплощенный,
Чтоб вдохновлять наш народ.
Иисусом Христом освященный
Людей к православью зовет.

В глаза посмотрите Софии,
На кроткий и ласковый взгляд.
Ведь были они голубые,
О светлой душе говорят.

На мудром лице вдохновенье,
Уверенность в деле святом.
Народу несла пробужденье
Все делала честно, с умом!

Боролась всю жизнь с униатством,
Успеха добиться смогла.
А Слуцкому нашему братству
Все силы и жизнь отдала.

Строила церкви и храмы
На Случчине  - древней земле.
Ходила в народ постоянно,
Людей просвещала в селе.

Еще молодая и кроткая,
Но в вере Христовой тверда.
Хоть жизнь прожила и короткую
Мы чтить ее будем всегда!

Идешь православный по городу,
Где памятник – остановись.
Смири свою душу гордую,
Софии святой поклонись!
(П. А. Девятериков)

## Праведнай Сафіі Слуцкай

Сафія праведная… Слуцкая княгіня…
З малітвай –просьбай перад Богам ты стаіш –
За край лясоў, за край азёраў сіні х
І за народ твой, што нясе пакутны крыж.

Ты запавет пакінула патомкам –
Захоўвай веры праваслаўнай чысты дар.
Прайшлі вякі… На Белай Русі столькі
Духоўнай крывадушнасці ахвяр.

Як вымаліць ад страшных мук пякельных
Бацькоў, дзядоў і прадзедаў маіх?
Запаланіў чужынскі дух касцельны
Сяброў і блізкіх – сэрцу дарагіх.

Схіляюся над ракаю святою
З балеснай скрухай – пачуццём віны:
І я з маёй ранейшай слепатою
Жыла пад гнётам нераскаянай маны.

Заступніца зямлі нашай – Сафія!
За горад Слуцк, за ўвесь гаротны край
Маліся… і малітвамі тваімі
Абманутыя душы прасвятляй.

Сафія мудрая… Агнём гарачай веры
І праўдай Божаю навекі спапялі
На Белай Русі ерасяў хімеры.
Малітвай, праведная, сэрцы ацалі.

*(Алена Сурба)*

## Святая София

Святая Слуцкая София
Хозяйкою у нас была.
Хоть времена были лихие,
Она народ к Христу звала.

Распространялось униатство,
У иезуитов гонор рос.
Им противостояло Братство,
Которое  любил Христос.

Отец и мать княжны без жали,
Отвергли унию напрочь.
В Софии веру утверждали,
Чтоб православной стала дочь.

Родители не долго жили,
Опекуном Хадкевич стал.
Чтоб не шумели Радивилы
За Януша ее отдал.

Обряд свершили православный,
Венчал их с Янушем Господь,
В соборе Бреста достославном,
Соединил их дух и плоть.

Сама княгиня молодая,
Идя по божеским стопам.
И православье утверждая,
Вела людей в Иисусов храм.

Была как мать, в любом приходе,
С ней Братство Слуцкое росло.
Пеклась она о всем народе
Ходила в церкви на село.

Чтоб люди жили в набоженстве,
Мечтая с Богом говорить,
Построен храм Преображенский,
Чтоб душу Господу открыть.

Заботы много проявляла
О храмах и монастырях.
Сама богатство умножала,
Чтоб православью дать размах.

За укрепленье веры в Братстве,
Сам Феофан благодарил
Раз не признала униатство
Нашла в душе довольно сил.

Жила и умерла без гнева,
А православие живет.
Взроди плоды ее посева
Чтит мать-Софию наш народ!
*(П. А. Девятериков)*

## Святая Слуцкая София

Прости нас, мудрая княгиня,
Что столько лет слепцами были.
Святая Слуцкая София,
Тебя мы помним, не забыли.
Росточком нежным прорастала
Ты с первых дней, став сиротою.
Защитой нашей веры стала
При жизни став для всех Святою.
Как много сделать ты успела,
Как мало лет земных прожила
Любовью, верою и делом
Народу своему служила.
Твой светлый лик в Святой иконе
Ты наша Вера и Святыня
В церковном колокольном звоне
София Слуцкая, княгиня.
*(Анатолий Балакир)*

## Сафіі Слуцкай

Сцяжынкай у сэрцы, у марах сцяжынкай
Вядзе нас у тыя часіны былыя
Такая ўзнёслая, нібы дзяўчынка,
Сама прыгажуня – княгіня Сафія.

Яна шкадавала галодных і хілых,
Яна прымірыла ўсіх сваякоў.
Яна Праваслаўе абараніла
І стала сапраўднай Святою Сафіяй
На час існавання вякоў.
*(Людміла Вечар)*

## София Слуцкая

Щедрой дланью да крестом
Город вечно осеняя,
В одиночестве простом
Ты стоишь, моя Святая,

В платье бронзовом, раскрыв
Руки настежь  всем случчанам,
Всех любовью освятив
Да молитвой непрестанной.

У дороги, над рекой,
У часовенки смиренно,
Крестишь город ты рукой,
Подарив благословенье.

Медный колокол – твой брат.
Крыша – голубое небо,
Ты в жару и в снегопад
Будешь символом победы.

*(С. Трофимова)*

***

***Унучка мужнай Настасіі,***
***Твой род праслаўлены спаўна.***
***Са светлым іменем Сафіі***
***квітнее Слуцкая зямля.***

***Звініць у звоне калакольным***
***Твой голас праўды, люба чуць.***
***І часам даўнім неадольны***
***Твае дабраты к нам ідуць.***

***Твае святыя справы лечаць***
***І сёння цела нам і душу.***
***Цябе сам Храм увекавечыў,***
***Цябе прызнаць бязбожнік мусіў.***

***Сафія Слуцкая - святыня,***
***І гонар наш, і абярэг–***
***Ніколі край свой не пакіне.***
***І возьме на сябе наш грэх.***

*(Н. А. Зяневіч)*

## Дадатак II

## Іконы святой праведнай Сафіі Слуцкай














## Дадатак III

### Вобраз Сафіі Слуцкай у жывапісе
















София Слуцкая


Обручение Софии Олелькович
и Януша Радзивилла



# Молитва

О святая праведная мати наша, блаженная княгине Софие, приими с любовию приношение веры, надежды и любве нашея и вознеси ко Господу, и яко в житии была еси помощница и заступница всем православным Христианом земли твоея, тако и ныне укрепи нас твердо и непоколебимо до смерти стояти за веру православную, согрей сердца наша любовию ко Господу и Пречистей Его Матери. Умоли Христа Бога нашего, да сохранит Церковь Свою святую от расколов и ересей, да утвердит в ней дух правыя веры и благочестия, дух ведения и любве, дух мира и радости вечныя, да вси духом и истиною покланяются Ему, да укрепит верных в благочестии и святости, да обратит отпадших от Православныя Церкви во святая недра ея.

О, святая мати, града Слуцка похвало и радосте, умоли Господа, да избавит град твой и вся грады и веси Белыя, Малыя и Великия Руси от глада, труса, потопа, огня, меча, нашествия иноплеменных и междоусобныя брани, от смертоносныя язвы, да ниспослет правителем нашим усердие, прозорливость, мудрость и верность, да управляют и судят по воле Его, да хранят установления Святыя Церкве. Испроси всем с верою притекающим к раце святых мощей твоих мирное житие, тишину, просвещение умов и сердец, соблюди их от козней вражиих, от соблазнов мира, во зле лежащаго, и от всякия скорби и нужды, обрати нас к покаянию и исправлению, даруй заблудшим истины познание, недугующим исцеление. Сохрани нас благодатными твоими молитвами от всех врагов видимых и невидимых и огради от всякаго зла, да прославим во вся дни жизни нашея Отца и Сына и Святаго Духа и твое заступление во веки веков. Аминь.

**Праведная Сафія, княгіня Слуцкая:**

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне**

**Складальнік:** Н. М. Нятрэбіна
**Рэдактар:** Л. В. Гурыновіч
**Камп'ютэрны набор:** Н. М. Нятрэбіна
Т.І. Стальмашонак

223610 Мінская вобл.
г. Слуцк вул. Капыльская 2а
Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка
**e-mail: biblio_slutsk@tut.by**